# МАСТАЦКАЯ КАНСТРУКЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВОБРАЗА СВЕТУ Ў АПОВЕСЦІ Ф.СІЎКО “УДОГ”

П.Р. Кошман
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна

Мастацкі свет літаратурнага твора, узнікаючы праз успрыманне і творчае ўзнаўленне свету рэальнага, змяшчае ў сабе адбітак як уяўленняў аўтара, так і таго жыццёвага матэрыялу, з якім ён працуе. Выдуманае і сапраўднае, творчае і рэальнае – гэтыя катэгорыі маюць зменлівыя суадносіны ў розныя перыяды развіцця літаратуры. Так, у параўнанні з літаратурнай класікай ХХ ст., набыткі якой звязваюцца найперш з выяўленнем праўды жыцця, сучасная беларуская проза ўсё часцей сцвярджае права аўтара будаваць мастацкі вобраз свету згодна з уласнымі творчымі планамі.

Яркі прыклад такога свабоднага падыходу да мастацкага канструявання рэчаіснасці прадстаўляе аповесць “Удог” Ф. Сіўко. Адметнае ў гэтым творы тое, што ў ім надзвычай арыгінальна, цалкам у духу сучаснасці, раскрываюцца тыя пытанні, якія ў беларускай мастацкай традыцыі ўстойліва пазначаны маркёрам нацыянальнага пачуцця. Звязаны з ім і добра вядомы айчыннаму чытачу набор злабадзённых праблем пісьменнік разглядае ў святле своеасаблівай канспіралагічнай тэорыі змовы чужынцаў супраць беларускасці. Перад чытачом паўстае хроніка быцця беларускага народа, трагічныя старонкі якой тлумачацца існаваннем удога – чужаземнага дрэва, якое здаўна культывуецца на нашай зямлі, каб атручваць-п’яніць сваімі крывава-чырвонымі ягадамі мясцовы люд.

Адаптацыя арыгінальнай аўтарскай задумкі да падзей беларускай гісторыі заўсёды ставіць перад пісьменнікам асаблівыя патрабаванні да таго, каб спалучэнне выдуманага і сапраўднага, фантазіі і факта выглядала гарманічным, было ўзгоднена паміж сабой. Свой аповед пра ўдога Ф. Сіўко разгортвае ў тых прасторава-часавых каардынатах, якія ў айчыннай мастацкай свядомасці з’яўляюцца класічнымі адзнакамі Бацькаўшчыны. Перад намі раскрываецца не раз апрабаваная ў беларускай літаратуры прасторавая мадэль нацыянальнага свету, у цэнтры якой вобраз-локус дома, панскіх пакояў, а калі крыху шырэй, то і ўсёй вёскі. Скрупулёзна адзначаючы змены ў знешнім выглядзе гэтага лакальнага свету, аўтар паказвае, як размераны ўклад жыцця беларуса мяняецца пад уздзеяннем часу. Яго стыхія, акрэсленая таксама знакавымі датамі беларускай гісторыі: 1570 г. – Лівонская вайна, 1831 г. – шляхецкае паўстанне, 1939 г. – пачатак Другой сусветнай вайны – мае важнае значэнне ў структуры твора. Разам з запісамі і лістамі герояў-відавочцаў, устаўленых у сюжэт запісах і лістах, дакладнае ўказанне на час надае эфект дакументальнасці, а значыць і пераканаўчасці, мастацкай гісторыі пра створанае аўтарскай фантазіяй дрэва ўдог.

МГПУ им. И.П.Шамякина

З мастацкага пункту гледжання вобраз удога атрымаўся вельмі значным, ёмістым. Заўважаныя ў яго знешнім выглядзе дэталі (іголкі па краях лісцяў, моцныя галіны, роўны і слізкі ствол) і звышнатуральная прага жыцця перадаюць агрэсіўную ўнутраную сутнасць гэтага дрэва, што ўвасабляе ў творы крыніцу зла. У прыродзе аналагам удога з'яўляюцца расліны інвазіўнага віду, якія запраграмаваны асвойваць новыя тэрыторыі і змяняць мясцовую экасістэму пад свае патрэбы. Урэшце, і ўдог спраўляецца з гэтай захопніцкай місіяй, што адзначае ў канцы аповесці вясковая цётка Польця: "Тут во: уперад адно было, а цяперака вун якія зараснікі. З насёна расцець. І ўсюдых так. Днямі сястры маёй Фэлі дачка з-пад Гродны прыязджала. І там ужэ поўна гэтых дзераваў. Як наўмысна хто сеець" [1, с. 168].

Вобраз удога вельмі сімвалічны. У аповесці акцэнтуецца ўвага на тым, што, падобна экалагічным нішам, чужародная сутнасць запаўняе і духоўныя пустоты. У цэлым выяўлены ў творы вобраз дрэва бачыцца вельмі нетыповым для нацыянальнай мастацкай традыцыі, у якой пад уплывам міфалагічнай спадчыны раслінны свет звычайна меў станоўчую семантыку, сімвалічна афармляўся ў знакавых вобразах (папараць-кветка, васількі, шыпшына і г.д.) і ніколі не надзяляўся агрэсіўнай, варожай сутнасцю. У аповесці Ф. Сіўко парушае нацыянальны літаратурны канон: удог – чужая расліна, але асабліва небяспечная менавіта тым, што ўжо даўно расце на нашай зямлі і стала для многіх за гэты час яе неад'емнай часткай. Адурманеныя яе ягадамі, мясцовыя жыхары не толькі страчваюць прыродны інстынкт самазахавання, актыўна губяць сябе і свой свет, але і пачынаюць цаніць дрэва за яго такія-сякія выгоды: "Улетку ад сонца схавацца і паесць тэж. У вайну ягадамі ратаваліся. Расцець бо велькае і ягад многа" [1, с. 18].

Злавесна-жудасная сутнасць удога, так відавочная чытачу, не усведамляецца большасцю герояў аповесці. Паказваючы, як буйнее гэтае дрэва на роднай зямлі, пісьменнік сімвалічна адлюстроўвае глыбіню крызісу нацыянальнай самасвядомасці, абсурднасць той сітуацыі, калі завезенае зло прызнаецца сваім, лічыцца неблагім набыткам, пра які варта клапаціцца. Тым самым статус роднага вызначаецца ў аповесці дастаткова нязвыкла: акрэсліваецца ў аповесці не фармальнай прыналежнасцю да тутэйшай зямлі, не гістарычным вымярэннем даўнасці прысутнасці на ёй, а толькі аўтэнтычным паходжаннем.

Традыцыйная для беларускай літаратуры праблема страты родных карэнняў набывае ў аповесці Ф. Сіўко новы аспект. Прычыны нацыянальнай трагедыі беларускага народа аўтар бачыць не ў адкрытай экспансіі знешніх варожых сіл, а ў той сітуацыі, калі адбываецца паступовая падмена ўнутранага зместу Радзімы. На прыкладзе перайменавання вёскі Дубраўка, якая, атрымаўшы новую назву –

МГПУ им. И.П.Шамякина

Падкрайна, губляе самастойны спрадвечны статус, пісьменнік засцярожвае чытача аб небяспецы перайначвання асноў нацыянальнага светаразумення.

Відавочна, што жанравыя магчымасці аповесці не дазваляюць прэтэндаваць на эпічную распрацоўку аўтарскай міфалагемы нацыянальнай бяды, увасобленай у вобразе ўдога. Аднак у творы застаецца адкрытым і фінал, і сам сюжэт. Прапанаваная аўтарам канструкцыя мастацкага свету дазваляе пры жаданні ўключыць у існуючую хроніку новыя эпізоды, надаць аповеду большую паслядоўнасць, дапаўняючы яго іншымі важнымі гістарычнымі датамі.

Абраная аўтарам сюжэтная лінія абумоўлівае спецыфіку мастацкага спасціжэння мінулага, дзе на першае месца выходзіць не столькі лагічная рэканструкцыя, колькі рэміфалагізацыя. Вобразам удога пісьменнік апелюе не да розуму, а да тых пачуццяў чытача, якія знаходзяцца на глыбінным узроўні, да тых архетыповых вобразаў свой – чужы, якія закладзены ў аснове нацыянальнага светаразумення. У гэтым кантэксце твор Ф. Сіўко выклікае прамыя асацыяцыі са зместам аповесці Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня”. Сувязь паміж імі, якая адзначаецца ў адзінстве аўтарскіх ідэй, часе і месцы дзеяння, настолькі моцная, што герояў кнігі XIX ст. можна лічыць не толькі папярэднікамі персанажаў сучаснага аўтара, але і іх прамымі родзічамі.

Такім чынам, аповесць Ф. Сіўко “Удог” характарызуецца распрацоўкай мастацкага свету, арыгінальнасць і значнасць якога асабліва ярка паўстае ў кантэксце нацыянальнай мастацкай традыцыі.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Сіўко, Ф.І. Эдэм: Прыпавесці, апавяданні, эсэ / Франц Сіўко. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. – 239 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина